САВЕТ МІНІСТРАЎ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

СОВЕТ МИНИСТРОВ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# П А С Т А Н О В А

# ПОСТАНОВЛЕНИЕ

20 чэрвеня 2018 г. № 468

г. Мінск

г. Минск

Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку правядзення Рэспубліканскага конкурсу ”Нацыянальная літаратурная прэмія“ і ўнясенні змянення ў пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 263

На падставе часткі першай пункта 5 артыкула 209 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры і ў мэтах стымулявання літаратурнага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь, папулярызацыі беларускай культуры Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць прыкладзенае Палажэнне аб парадку правядзення Рэспубліканскага конкурсу ”Нацыянальная літаратурная прэмія“.

2. Из графы ”Организаторы культурного мероприятия“ пункта 89 перечня отдельных международных и республиканских централизованных культурных мероприятий, проводимых на территории Республики Беларусь, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 апреля 2015 г. № 263 ”О проведении на территории Республики Беларусь отдельных централизованных культурных мероприятий“ (Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 07.04.2015, 5/40356; 01.02.2017, 5/43294), слова ”Минский горисполком,“ исключить.

3. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

Прэм’ер-міністр
Рэспублікі Беларусь А.Кабякоў

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
20.06.2018 № 468

# ПАЛАЖЭННЕ
аб парадку правядзення Рэспубліканскага конкурсу ”Нацыянальная літаратурная прэмія“

1. Дадзеным Палажэннем вызначаецца парадак правядзення Рэспубліканскага конкурсу ”Нацыянальная літаратурная прэмія“ (далей – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца штогод у мэтах падтрымкі развіцця беларускай мастацкай літаратуры і творчасці пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь, стымулявання стварэння імі новых высокамастацкіх твораў у галіне паэзіі, прозы, драматургіі, публіцыстыкі, літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства для дарослых, дзяцей і юнацтва, папулярызацыі кнігі і чытання ў грамадстве.

3. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі і грамадскае аб’яднанне ”Саюз пісьменнікаў Беларусі“.

4. Для падрыхтоўкі і правядзення конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні конкурсу (далей – арганізацыйны камітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і зацікаўленых арганізацый. Склад арганізацыйнага камітэта конкурсу зацвярджаецца Міністэрствам інфармацыі.

Арганізацыйны камітэт:

вырашае пытанні арганізацыйнага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння арганізацыі і правядзення конкурсу;

зацвярджае склад экспертнай камісіі і журы;

вырашае іншыя пытанні, якія ўзнікаюць у працэсе арганізацыі і правядзення конкурсу.

5. Экспертная камісія ствараецца ў складзе да 11 чалавек, журы – у складзе да 9 чалавек.

У склад экспертнай камісіі і журы могуць уваходзіць прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, творчых саюзаў, арганізацый, якія ажыццяўляюць выдавецкую дзейнасць (далей – выдавецкія арганізацыі), кнігагандлёвых арганізацый, юрыдычных асоб, на якія ўскладзены функцыі рэдакцыі сродкаў масавай інфармацыі (далей – рэдакцыі СМІ), арганізацый культуры, устаноў адукацыі і навуковых арганізацый, якія

ажыццяўляюць дзейнасць у галіне мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

У склад журы не могуць уваходзіць аўтары твораў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе.

Экспертную камісію і журы ўзначальваюць старшыні, якія вырашаюць усе пытанні іх работы ў адпаведнасці з дадзеным Палажэннем.

6. Арганізацыйнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці экспертнай камісіі і журы конкурсу ажыццяўляе Міністэрства інфармацыі.

7. Выплату грашовых прэмій ажыццяўляюць:

Міністэрства інфармацыі – у намінацыях ”Лепшы твор (зборнік твораў) паэзіі“, ”Лепшы твор публіцыстыкі“, ”Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства“;

Міністэрства культуры – у намінацыях ”Лепшы твор драматургіі“, ”Лепшы дэбют“ (першая публікацыя ці выданне аўтара ў жанрах паэзіі, прозы, публіцыстыкі);

Міністэрства адукацыі – у намінацыях ”Лепшы твор прозы“, ”Лепшы твор для дзяцей і юнацтва“.

Арганізацыйнае забеспячэнне дыпломамі, прызамі – сімваламі конкурсу, падрыхтоўку і правядзенне цырымоніі ўзнагароджання ажыццяўляе Міністэрства інфармацыі.

8. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама аўтарскія калектывы ў складзе не больш за чатыры чалавекі – аўтары арыгінальных твораў мастацкай літаратуры ў жанрах паэзіі, прозы, публіцыстыкі, драматургіі, літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства на беларускай або рускай мове, упершыню выпушчаных у свет выдавецкімі арганізацыямі Рэспублікі Беларусь у выглядзе асобных выданняў і (ці) апублікаваных у сродках масавай інфармацыі (далей – СМІ) літаратурна-мастацкай накіраванасці з 1 студзеня да 31 снежня года, які папярэднічае году правядзення конкурсу, атрымаўшых грамадскае прызнанне.

Крытэрыямі, якія сведчаць аб грамадскім прызнанні твораў, з’яўляюцца:

колькасць і змест артыкулаў, рэцэнзій, водгукаў у СМІ, на інтэрнэт-рэсурсах (інфармацыю прадстаўляе аўтар);

аб’ёмы продажу экзэмпляраў выдання твора праз кнігагандлёвую сетку (інфармацыю прадстаўляе Міністэрства інфармацыі);

запатрабаванасць кніг з прадстаўленымі на конкурс творамі ў публічных бібліятэках (інфармацыю прадстаўляе Міністэрства культуры);

колькасць пісьмовых водгукаў чытачоў (інфармацыю прадстаўляе аўтар);

паказы спектакляў, пастаўленых па творы драматургіі, якія прадстаўлены на конкурс (інфармацыю прадстаўляе пры наяўнасці Міністэрства культуры);

пераклады твора на іншыя мовы свету (інфармацыю прадстаўляе аўтар).

9. Конкурс праводзіцца па намінацыях з прысуджэннем дыпломаў, прызоў – сімвалаў конкурсу, а таксама грашовых прэмій у наступных памерах:

”Лепшы твор (зборнік твораў) паэзіі“ – 100 базавых велічынь;

”Лепшы твор прозы“ – 100 базавых велічынь;

”Лепшы твор драматургіі“ – 100 базавых велічынь;

”Лепшы твор публіцыстыкі“ – 100 базавых велічынь;

”Лепшы дэбют“ (першая публікацыя ці выданне аўтара ў жанрах паэзіі, прозы, публіцыстыкі) – 50 базавых велічынь;

”Лепшы твор для дзяцей і юнацтва“ – 100 базавых велічынь;

”Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства“ – 100 базавых велічынь.

10. Адзін аўтар (аўтарскі калектыў) можа прымаць удзел у конкурсе не больш чым у адной намінацыі.

У намінацыі ”Лепшы твор (зборнік твораў) паэзіі“ дапускаецца ўдзел зборніка твораў аднаго аўтара.

Удзел у конкурсе твораў аўтараў, якія памерлі на момант падачы заяўкі (акрамя асоб, што ўваходзілі ў склад аўтарскага калектыву па падрыхтоўцы твора), не дапускаецца.

11. У выпадку, калі пераможцам конкурсу з’яўляецца аўтарскі калектыў, яму ўручаецца адзін дыплом і прыз – сімвал конкурсу, а грашовая прэмія дзеліцца ў роўных долях паміж усімі членамі аўтарскага калектыву.

Доля грашовай прэміі, прадугледжаная для асобы, што ўваходзіла ў склад аўтарскага калектыву, але памерла на момант падачы заяўкі, атрымліваецца ў спадчыну ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

12. Заяўкі на ўдзел у конкурсе (далей – заяўкі) прымаюцца Міністэрствам інфармацыі да 1 красавіка года, у якім праводзіцца конкурс, ад фізічных асоб – аўтараў твораў або іх афіцыйных прадстаўнікоў, а таксама ад творчых саюзаў, выдавецкіх арганізацый, рэдакцый СМІ, арганізацый культуры, устаноў адукацыі і навуковых арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць у галіне мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

13. Да заяўкі дадаюцца наступныя дакументы:

ліст-хадайніцтва аб вылучэнні для ўдзелу ў конкурсе;

інфармацыя аб аўтары і творы, які прадстаўлены на конкурс;

два экзэмпляры друкаванага выдання або СМІ, у якіх апублікаваны твор, прадстаўлены на конкурс.

14. Заяўкі, якія прадстаўлены з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых у пунктах 8, 12 і 13 дадзенага Палажэння, не прымаюцца.

15. Заяўкі перадаюцца Міністэрствам інфармацыі ў экспертную камісію.

Спіс дапушчаных да ўдзелу ў конкурсе твораў публікуецца Міністэрствам інфармацыі ў газеце ”Літаратура і мастацтва“ і размяшчаецца на сайце Міністэрства інфармацыі ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт.

16. Экспертная камісія разглядае прадстаўленыя на конкурс творы з улікам іх адпаведнасці крытэрыям, прадугледжаным у пункце 8 дадзенага Палажэння, знаёміцца з іх зместам і ажыццяўляе фарміраванне пераліку твораў, якія вылучаны для ўдзелу ў фінале конкурсу.

Пасяджэнне экспертнай камісіі лічыцца правамоцным, калі на ім прысутнічае не менш за дзве трэці агульнай колькасці яе членаў. Аўтары твораў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе і ўваходзяць у склад экспертнай камісіі, не маюць права галасаваць за свае творы.

Рашэнні экспертнай камісіі прымаюцца адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў членаў камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У спрэчных выпадках рашаючым з’яўляецца голас старшыні экспертнай камісіі.

Пры неабходнасці экспертная камісія мае права запатрабаваць у юрыдычных і фізічных асоб, якія вылучылі аўтараў і іх творы на саісканне прэміі, дадатковыя звесткі аб гэтых аўтарах і іх творах, неабходныя для прыняцця абгрунтаванага рашэння наконт уключэння ў пералік твораў, што вылучаны для ўдзелу ў фінале конкурсу.

Спіс твораў, якія вылучаны для ўдзелу ў фінале конкурсу, публікуецца ў газеце ”Літаратура і мастацтва“ і размяшчаецца на сайце Міністэрства інфармацыі ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт для ўсеагульнага абмеркавання.

17. Азнаямленне журы з творамі, адабранымі экспертнай камісіяй для ўдзелу ў фінале конкурсу, ажыццяўляецца з 15 чэрвеня па 15 ліпеня года, у якім праводзіцца конкурс.

Пасяджэнне журы, на якім вызначаюцца пераможцы конкурсу, праводзіцца ў трэцяй дэкадзе ліпеня года, у якім праводзіцца конкурс. Пасяджэнне з’яўляецца правамоцным, калі на ім прысутнічае не менш за дзве трэці ад агульнай колькасці членаў журы.

Пераможцы ў намінацыях вызначаюцца шляхам галасавання (па рашэнні журы – адкрытым ці тайным) простай большасцю галасоў членаў журы, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку, калі два ці больш творы набралі аднолькавую колькасць галасоў, пераможцам прызнаецца твор, за які аддаў голас старшыня журы.

Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і не падлягае перагляду.

Вынікі конкурсу абвяшчаюцца не пазней за 6 жніўня.

18. Падвядзенне вынікаў галасавання ажыццяўляе падліковая камісія, склад якой вызначаецца старшынёй журы з ліку членаў журы на пасяджэнні. Па выніках работы падліковая камісія складае пратакол, які падпісваюць старшыня журы і члены падліковай камісіі.

19. Узнагароджанне пераможцаў конкурсу праводзіцца ва ўрачыстай абстаноўцы ў час святкавання Дня беларускага пісьменства.

20. Выдаткі, звязаныя з вырабам дыпломаў і прызоў – сімвалаў конкурсу, выплатай грашовых прэмій, а таксама падрыхтоўкай і правядзеннем цырымоніі ўзнагароджання, ажыццяўляюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжаных дзяржаўным органам – арганізатарам конкурсу на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Выдаткі, звязаныя з удзелам членаў экспертнай камісіі, журы конкурсу ў рабоце гэтых камісіі і журы, аўтараў, вылучаных юрыдычнымі і фізічнымі асобамі для ўдзелу ў конкурсе, у цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў конкурсу (уключаючы праезд, харчаванне і пражыванне), аплачваюцца за кошт сродкаў арганізацый, у якіх працуюць ці вучацца названыя асобы (у тым ліку грамадскіх аб’яднанняў, членамі якіх яны з’яўляюцца), а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.